Источник: "Рэспубліка" - 2018-02-20

ЗАЎТРА

# РАЗМАЎЛЯЙЦЕ ПА-БЕЛАРУСКУ

**На ўсёй краіне пройдуць тэматычныя вечарыны, сустрэчы з пісьменнікамі, конкурсы, канцэрты, прысвечаныя Міжнароднаму дню роднай мовы.**

Па-беларуску размаўляюць усё больш людзей, сёння гэта ўжо не мова чалавека ад касы і сахі, як лічылася раней, а сродак зносін адукаваных, інтэлігентных людзей. На думку першага намесніка дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Аляксандра Лукашанца, яна робіць нас адметнай нацыяй ва ўсім свеце, больш таго — дапамагае прыязным адносінам да нас замежнікаў. Беларускую мову зараз вывучаюць з першага класа. Да таго ж з кожным годам ідзе выраўноўванне гадзін яе выкладання ў школе ў параўнанні з рускай. Міністэрствам адукацыі распрацавана больш за сорак факультатываў, якія дазваляюць вывучаць яе паглыблена. Усяго ж 1325 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, што складае 47 працэнтаў ад агульнай іх колькасці, вядуць навучанне па-беларуску.

Усё больш актыўна ідзе праца па ўжыванні роднага слова ў арганізацыях Міністэрства культуры. Галоўнае, што выдатны прыклад паказвае галаўная ўстанова, дзе дакументаабарот вядзецца пераважна па-беларуску. Дарэчы, у 2017-м Дні культуры Беларусі прайшлі ў пяці краінах, у Пекіне адкрыўся наш культурны цэнтр.

**Наталля СЦЯПУРА**
stepuro@sb.by

Наталля Сцяпура. Размаўляйце па-беларуску